**VENSKOVICH M.S., SHPUDEIKO L.N. Integrative technologies of managing students' independent classroom activities in professionally oriented foreign languages teaching at a technical university**

The article is devoted to the problem of possibility and expediency of using integrative technologies of managing students' independent classroom activities in terms of professionally-oriented foreign languages teaching at a higher technical educational establishment. On the basis of the analysis of available theoretical research and practical teaching techniques of planning, organizing and managing learners' independent activities, the authors set forth their own point of view on the given matter and offer a complex integrative approach to efficient managing and supervising students' foreign languages learning.

Considering today's curriculum requirements set to the volume of classroom and autonomous activities in foreign languages and taking into account the offer of the Ministry of Education on giving not less than 50 % of school hours for students' independent work, the authors make a conclusion about expediency of working out necessary study-guides based on integrative technologies of managing independent classroom activities of technical university students.

УДК 82.09

***Борсук Н.М.***

# АБ ПАШЫРЭННІ ГУМАНІСТЫЧНЫХ РАМАК СПАСЦІЖЭННЯ СЛАВЕСНАГА МАСТАЦТВА: АСПЕКТЫ ТВОРЧЫХ НАПРАЦОВАК ЛІТАРАТУРАЗНАЎЦЫ Ю.В. ПАТАЛКОВА

У XX стагоддзі, у эпоху рэвалюцый і войнаў, чалавецтва апынулася перад вялікімі выпрабаваннямі. Паглыбляўся працэс разбурэння грамадска-сацыяльнага жыцця, які, зразумела, не спрыяў развіццю асобы, адчуванню гармоніі ў яе зносінах са светам. Чым больш трагічнымі і абвостранымі аказваліся маральныя канфлікты ў сучасным грамадстве, тым відавочней мы адчувалі неабходнасць наталіць духоўную смагу ў звароце да мастацтва, адшукаць у змесце даўно прачытаных вядомых твораў адказы на хвалюючыя пытанні: «Хто мы ёсць?», «Калі, як і дзеля чаго з'явіліся на гэтым свеце?», «Да якога працягу (а можа быць, апакаліпсісу?) крочыць чалавецтва?».

Нельга было не заўважыць, што эпоха Асветніцтва паступова адыходзіла ў нябыт, на змену чалавеку-пераўтваральніку ішоў чалавек, «падуладны імператыву ўсхваляванага сумлення». Наступала эпоха Суперажывання. «Усё, што ў сюжэтах выступае адлюстраваннем сацыяльнай і гістарычнай абумоўленасці, скрупулёзна вывучаецца і сёння, але ўжо не ўспрымаецца як вычарпальнае. Чалавецтву патрэбна асэнсаваць сваё месца ў рэчаіснасці надсацыяльнай, надрацыянальнай, метафізічнай, анталагічнай, яно шукае вышэйшага сэнсу быцця» [2, с. 28].

Суперажыванне – слова грэчаскае (empatheia). Згадзіцеся: з'ява, якая ўвасоблена ў гэтым паняцці, ужо шмат тысячагоддзяў. Суперажыванне не залежыць ад жадання індывіда, не мае нічога агульнага са спачуваннем альбо міласэрнасцю. Тэхнагенныя катастрофы, прыродныя катаклізмы, жыццёвая мітусня не спрыяюць развіццю гэтага пачуцця. Як ні трагічна канстатаваць такі факт, але толькі смяротнае дыханне планеты, якое адчуюць усе і адначасова, прывядзе грэшных людзей, што жывуць па прынцыпу «Пасля нас хоць патоп», да суперажывання (эмпатыі). «Эмпатыя – адвечнасць: усё ў біясферы ўзаемазвязана, узаемаабумоўлена. Суперажыванне не трэба выдумляць. Папросту іншага шляху духоўнага быцця ў чалавецтва няма» [3, с. 8], — лічыць літаратуразнаўца Ю.В. Паталкоў. Да гонару нашага калегі, настаўніка, кандыдата філалагічных навук, дацэнта кафедры беларускай і рускай моў БрДТУ, асобы з выразна акрэсленай актыўнай жыццёвай пазіцыяй, неабходна адзначыць, што менавіта Юрый Васільевіч Паталкоў першым уводзіць у літаратуразнаўства і методыку паняцце «эмпатычны погляд на мастацкі твор».

Набліжэнне да эмпатычнай ідэі, на думку даследчыка, павінна пачынацца з упрымання мастацтва. Безумоўна, ні літаратуразнаўцы, ні настаўнікі прыгожай славеснасці не маюць права заставацца ўбаку ад гэтых тэндэнцый. Ю. Паталкоў сваімі даследаваннямі аргументавана пераконвае скептыкаў, што эмпатычны погляд на прыгожае – гэта не нейкая чарговая навацыя, не рамантычная тэорыя «Чудаковатого Пилигрима», гэта навуковая канцэпцыя.

Паважаны чытач! Каб Вы мелі магчымасць пераканацца ў гэтым, прапануем Вам з адпаведным пачуццём такту перагарнуць разам з намі старонку за старонкай літаратуразнаўчыя артыкулы Ю. Паталкова, разам з даследчыкам выйсці за сацыяльныя межы, за канкрэтную гістарычнасць, за структурную пабудову твора, зрабіць прадметам свайго даследавання – «вобраз, убачаны знутры» (паводле А. Яскевіча). У выніку Вы трапіце ў сітуацыю маральнага выбару. Якім ён стане для кожнага з вас – права кожнага.

Ю.В. Паталкоў у сваіх літаратуразнаўчых працах, у будучай кнізе (рабочая назва «Суперажыванне») грунтоўна асэнсоўвае канкрэтна-гістарычныя, навуковыя перадумовы эмпатычнага літаратуразнаўства. Скразной лініяй праз яго даследаванне праходзіць думка, што «эмпатия (сопереживание) является нравственным лейтмотивом всей мировой литературы и как таковая требует выработки способов своего научного осмысления»; што традыцыі пакаяннага чалавека, нягледзячы на наступствы сацыялістычнага рэалізму, паспяхова развіваліся ў рускай і беларускай літаратурах (творчая спадчына Ф. Дастаеўскага, М. Гарэцкага, К. Чорнага і інш.). Сістэма вывучэння літаратуры, заснаваная на прыярытэце эмацыянальнага над рацыянальным, паступова знаходзіць сваіх прыхільнікаў (Я. Чыквін, Г. Тврановіч, А. Яскевіч, У. Конан і інш.).

Вызначыць «нравственную спасительность» мастацкага твора – прэрагатыва літаратуразнаўства. З гэтай пазіцыяй даследчыкаў нельга не пагадзіцца. «В понятийном аппарате наук, изучающих человека, нет, скажем, категории «сердца». В искусстве слова «сердце» может и мыслить, и чувствовать, и страдать, то есть становиться некоей этико-эстетической категорией, мифологемой, вполне адекватно и даже сверхадекватно репрезентующей духовную суть человека» [4, с. 94]. Па гэтай прычыне, як сведчаць артыкулы Ю. Паталкова, літаратуразнаўца спыняецца на мастацкіх творах, у якіх аб'ектам пісьменніцкага адлюстравання сталі не «гегемоны», «не безасабовы калектыўны герой», а асобы духоўна багатыя, а калі больш дакладна, – «духовность человеских переживаний» [5, с. 64].

Знакавымі ў рэчышчы новай навуковай тэндэнцыі, з пункту погляду аўтара артыкула «Эмпатическое литературоведение», з'яўляюцца вершы Я. Купалы «Мая малітва» і А.Твардоўскага «Я знаю: никакой моей вины...». Нельга не пагадзіцца з даследчыкам, што ў гэтых паэтычных творах зафіксаваны пераходны стан у душэўным настроі асобы: вяршыцель лёсу, атэіст саступае месца чалавеку пакаяннаму, які не адмаўляецца ад пераўтварэння свету, але тонка адчувае этычныя межы, за якія асоба не мае маральнага права пераступіць. Свет успрымаецца чалавекам як з'ява загадкавая і недасягальная.

На думку Ю. Паталкова, суперажывальнае літаратуразнаўства актуалізуе праблему этыкі чытання. Мае рацыю Юрый Васільевіч,

***Борсук Ніна Мікалаеўна**, кандыдат філалагічных навук, загадчык кафедры беларускай і рускай моў Брэсцкага дзяржаўнага тэхнічнага універсітэта.*

*Беларусь, БрГТУ, 224017, г. Брест, ул. Московская, 267.*

калі выказвае меркаванне, што рацыянальны, «безасабовы» аналіз мастацкага вобраза ператварае чытача ў раўнадушнага назіральніка сюжэта, што, па-першае, небездакорна ў этычным плане, па-другое, перашкаджае чытачу наладзіць герменеўтычны дыялог з персанажам. «Сопереживательный способ познания литературы поднимает чтение до священнодействия (сравним его в этом случае, к примеру, с писанием икон)» [6, с. 7]. Тым не менш, Юрый Васільевіч не адмаўляецца ад рацыянальнага аналізу мастацкага твора. «... А што да аналізу мастацкага твора, дык ён заўсёды патрэбен. Тую частку вобразнага зместу, якая можа ўспрымацца свядомасцю чытача, трэба аналізаваць. Але нельга перабольшваць мажлівасці і прэрагатывы аналізу» [3, с. 6]. На старонках артыкулаў «Этыка духоўнага выжывання», «Адвечнасць, якая перамагае» Ю. Паталкоў вядзе размову не пра апазіцыю рацыянальна-аналітычнага падыходу да твора, а пра пашырэнне гуманістычных рамак спасціжэння славеснага мастацтва. На наш погляд, такі падыход дазволіць сучаснаму чытачу ўбачыць у мастацкім творы тыя праявы сюжэта, якія будуць садзейнічаць ачышчэнню асобы ад ганебнага практыцызму, духоўнай разгубленасці, сацыяльнай неакрэсленасці. Невыпадкова Ю. Паталкоў «вывучэнне мастацкага твора трактуе як форму духоўнага выжывання асобы праз творчае асэнсаванне (спасціжэнне пачуццём) ёю маральна-эстэтычнага даробку чалавецтва» [7, с. 13]. Думаецца, не толькі даробку.

Так, у артыкуле «Адвечнасць, якая перамагае. Эмпатычны погляд на п'есу «Хто смяецца апошнім» Кандрата Крапівы» даследчык паказаў, як эмпатыя дазваляе ўбачыць нам у мастацкім творы тыя негатыўныя праявы чалавечага характару, якія жывуць у кожным з нас і праяўляюцца, як толькі наша душа засынае, заспакойваецца. Юрый Васільевіч перакананы, што нікчэмнасці «зёлкінскага» роду, тулягі, гарлахвацкія і падобныя да іх прыходзяць у наша жыццё не з якіх-небудзь казачных палацаў. Як тут не пагадзіцца з даследчыкам. Мы самі ствараем для іх глебу. Адчуванне страху па прычыне аддалення ад адвечнага суперажывання, соцыяпрыродная сутнасць якога ўвасоблена ў жыццёвай пазіцыі вышэйзгаданых персанажаў, і стала, з пункту погляду аўтара артыкула, прычынай напісання К. Крапівой п'есы «Хто смяецца апошнім».

Заслуга Ю. Паталкова бачыцца яшчэ і ў тым, што аўтар артыкула «Уласная поўня. Сустрэча з апавяданнем «Сузіранне начной поўні» Алеся Наварыча» дапамагае нам узняцца ад назіральнага спосабу жыцця да сузіральнага, выразна ўсвядоміць задачу мастацтва. Яна не ў тым, выказвае меркаванне Юрый Васільевіч, каб твор зіхацеў прыгожымі мастацкімі сродкамі, каб творца даваў карысныя парады чытачу, павучаў, а ў стварэнні духоўнага настрою твора, паказе асаблівасцей менталітэту народа, «унутранага сусвету асобы» (паводле Ю. Паталкова), якая, адчуўшы дысгарманічныя праявы жыцця «на крыважорнай, неразумна-мыснай Зямлі», імкнулася да той маральнай поўні, без якой немагчымае годнае чалавечае жыццё» [ 8, с. 34].

Ю. Паталкоў не стамляецца паўтараць: «Літаратура – не адлюстраванне жыцця, а само жыццё, сам боль, увасоблены ў мастацкім вобразе. Толькі боль, таму што радасць – гэта пераадолены боль» [7, с. 13]. Зыходзячы з гэтага вызначэння альбо з адвечнага жыццёвага прынцыпу «Спярша палюбі, потым зразумей», Юрый Васільевіч робіць спробу даць адказы на пытанні, якія хвалююць не адно пакаленне настаўнікаў: ці маральна вывучаць біяграфію пісьменніка да знаёмства з творамі пісьменніка? Ці мэтазгодна мастацкі сюжэт успрымаць як апісанае дзеянне, а не як увасоблены стан? Чаму аналізам мастацкага вобраза мы называем увесь аб'ём духоўнага кантакту школьніка з тэкстам? Наколькі этычна ўспрымаць твор як апісанне вонкавага матэрыялу (таго, што было дзесьці, калісьці, з кімсьці, ды толькі не са мною)? Чаму праграмы, падручнікі, дапаможнікі па літаратуры будуюцца паводле тэматычнага прынцыпу? [9] і інш.

Жыццёвая пазіцыя нашага калегі становіцца амаль што фізічна адчувальнай пасля знаёмства з артыкулам «Путь к покаянию (об одной «неудобной» строке В. Маяковского)». Юрый Васільевіч не цынік. Удзяліўшы столькі ўвагі «кашчунскаму» радку У. Маякоўскага «люблю смотреть, как умирают дети», даследчык падкрэсліў гэтым самым вызначальны сэнс слоў з верша «Несколько слов обо мне самом» як у творчай спадчыне рускага паэта, так і ў філасофскіх пошуках чалавека, літаратуразнаўцы Ю. Паталкова. У гэтым паэтычным радку ўвасоблена споведзь чалавека, які адчувае, як ён паступова страчвае міласэрнасць; у гэтым радку – страх, каб не ператварыцца ў злосную істоту, бо жыць даводзіцца «в уродце-веке». У гэтым радку – зварот стомленай душы да абыякавых людзей з надзеяй, што яны здольныя яшчэ рэагаваць калі не на дабро, то на жахі. Згадзіцеся, калі б жыццё дзяцей у свеце дарослых было ціхамірным, наўрад ці нарадзіўся падобны паэтычны радок У. Маякоўскага. Для Ю. Паталкова важна, каб чалавек здольны быў спыніцца, угледзецца ў твары людзей, вучыўся спачуваць не абстрактным масам, а канкрэтнаму чалавеку з яго непаўторным шчасцем і бядой. Як бачна, «неудобная строка оказалась гуманной в своей нравственной основе, поскольку метафорически объявила о жестоком расчеловечивании эпохи» [10, с. 113]. Як бачна, даследчык-гуманіст, чалавек-творца Юрый Васільевіч ідзе да «невідушчых» – не з іроніяй, не з выкрываннем няпраўды, а са спачуваннем і даверам, з надзеяй на прасвятленне згодна запавету У. Маякоўскага («Я одинок, как последний глаз / у идущего к слепым человека!»).

Звернемся да артыкула «Борис Зайцев и Кузьма Чёрный в кругу мифологемы «сердце»«. Даследчык, спыніўшыся на апавяданнях рускага і беларускага творцаў «Авдотья – смерть» і «Начлег у вёсцы Сінегах», раскрывае характар Жанчыны-Маці – Маці-Заступніцы, робіць спробу зазірнуць у глыбіні спакутаванай жаночай душы.

«Вялікі паход скупы на адпачынак» – словы К. Чорнага, якія неаднойчы цытуе Ю.Паталкоў. Яны – своеасаблівы ключ да разумення маральна-філасофскага прынцыпу разглядаемага артыкула: праз адлюстраванне чалавечага болю – да спачування канкрэтнай асобе, няхай і даволі ўнутранасупярэчлівай; праз спачуванне літаратурнаму герою – да спасціжэння сябе – я які? Ад адказу на гэтае пытанне залежыць не толькі жыццёвая дарога таго, хто ставіць перад сабой падобнага роду пытанні, але і лёс стагоддзя, чалавецтва. І той факт, што Ю. Паталкоў вядзе барацьбу за чалавечыя душы праз далучэнне чытачоў да духоўных каштоўнасцей дзвюх культур: рускай і беларускай, – яскравае сведчанне таму, што даследчыка на сучаным этапе перш-наперш цікавіць «объединяющая литературы возвышенность гуманистического чувства» [5, с. 62]. І ў гэтым, безумоўна, таксама заслуга літаратуразнаўцы.

«Заглянуть в зрачки века» – так паэтычна, словамі В. Мандэльштама фармулюе Ю.Паталкоў наступную задачу, што стаіць перад ім як даследчыкам на шляху далейшага духоўнага ўдасканалення асобы.

Па гэтай прычыне падчас асэнсавання трагедыі 30-ых гадоў у полі зроку Юрыя Васілевіча не гістарычныя падзеі: рэпрэсіі, калектывізацыя, індустрыялізацыя, – а складаны, супярэчлівы свет асобы. Ю. Паталкоў паказвае, як гіпертрафіраваная калектывісцкая мараль пестуе адмоўныя якасці, асабліва моладзі: «Юным был возраст не только Вольки, но и всей той жизни, которая окружала её» [11, с. 88].

Цытата з апавядання Л. Калюгі «Цеснаватая куртачка» нагадвае пра жахлівыя выпрабаванні стагоддзя, што знайшлі адбітак у лёсе кожнай асобы. Юрый Васільевіч тонка адчувае, што «набліжэнне цывілізацыі да апакаліпсісу духу» з'явілася ворагам не менш жорсткім, чым захопнікі, якія неаднойчы прыходзілі на нашу зямлю.

Адсюль «интонация терпеливого произнесения правды» [12, с. 92], непрыхаваны смутак, якім прасякнуты кожны радок артыкулаў «Метафорические вечера сокровенного человека», «Молитва матери (Максим Горький и Янка Купала в 1906 году)».

Сходы, працэнты калектывізацыі, грамадскія даручэнні, якія выконвае Волька, гераіня апавядання Л. Калюгі «Цеснаватая куртачка», не столькі па абавязку, бо камсамолка, колькі па сваёй ахвоце, не змаглі замяніць жанчыне асабістага шчасця. Абмежаваныя ўяўленні пра добрае жыццё і ў Адася. Не навучаны ён жыццём разумець складанасць душы чалавека. Вызначальным крытэрыем для яго ў жыцці стаў «хлеб», матэрыяльныя вынікі працы і слова «трэба», як і для гераіні твора А. Платонава «Песчаная учительница».

Сваімі разважаннямі Ю. Паталкоў прыводзіць нас да адчування: наколькі гэтыя героі няшчасныя. Па перакананні даследчыка, ключ да разумення паводзінаў не толькі гераінь Л. Калюгі і А. Платонава, але Паўла Уласава і яго сяброў, народа, да якога Я. Купала звяртаўся са словамі «Паўстаньце!», у пакутніцкай рэпліцы Нілаўны з рамана М. Горкага «Мать» – «Несчастные...». Яны не могуць змяніць жыццё,

прывесці да свабоды, бо самі не свабодныя. Бяздумная рашучасць, здольнасць «перешагнуть» праз чалавека, самаахвяраванне ў імя агульнага шчасця маці дачкой, сынам, сваім асабістым шчасцем, шчасцем канкрэтнага чалавека – сведчанне іх не свабоды.

Безумоўна, час змяніўся. Сённяшняе жыццё не патрабуе «растворения личности в интересах коллектива», але сучасны чалавек так і не навучыўся быць шчаслівым. Асэнсоўваючы жыццё Волькі і Марыі, гераінь Л. Калюгі і А. Платонава, Юрый Васільевіч нагадвае, што «односторонне понятый труд препятствует душевной неповторимости человека» [11, с. 87]. Толькі б за гэты напамін нам Юрый Васільевіч дастойны вечнага быцця ў свеце людзей.

Цяжка не заўважыць, што Юры Васілевіч пастаянна звяртаецца пры вывучэнні рускага славеснага мастацтва да матэрыялаў беларускай літаратуры. І гэта не суб'ектыўна абраны даследчыцкі ход. Па перакананні Ю. Паталкова, прыём гэты абумоўлены «исторически сложившейся взаимодополняемостью русского и белорусского этносов в осмыслении ими нравственной сущности бытия».

Не застаецца па-за ўвагай даследчыка літаратура эміграцыі. І прычына зусім не ў тым, што творы пісьменнікаў Замежжа дададуць новае да палітычнага, эстэтычнага, этычнага вопыту чалавецтва, паўплываюць на мастацкія пошукі сучасных літаратараў, высвятляць факты гісторыі, якія доўгі час замоўчваліся. Для Юрыя Васільевіча літаратура эміграцыі, настроі, учынкі яе персанажаў уяўляюцца «самастойным маральным феноменам», які дапаможа чытачу зразумець асноўныя рысы асабістага духоўнага свету.

Сваю задачу Юрый Васільевіч бачыць у набліжэнні чытача да духоўнага «микромира героя-изгоя», які на скразняках суровага часу не страціў пачуццё ўласнай годнасці. З гэтаю мэтаю даследчык звяртаецца да асэнсавання творчасці М. Сяднёва і У. Набокава. У пошуках адказу на пытанне «Хто вінаваты?» лірычны герой М. Сяднёва, разважае Юрый Васільевіч, не ўпадае ў самазнішчальнае пакаянне, хаця і разумее, што не бывае людзей невінаватых. Ён спрабуе супрацьстаяць і асабістым сумненням, і магчымым абвінавачванням нашчадкаў. Такім чынам, Ю. Паталкоў у артыкуле «Литературная эмиграция как морально-психологический феномен (на материале лирики В. Набокова и М. Седнёва)» [13] уступае ў палеміку з самім сабой ранейшым, аўтарам даследавання «Эмпатическое литературоведение» [6]. Літаратуразнаўца сцвярджае, што вытокі пакаяння складваліся задоўга да з'яўлення верша А. Твардоўскага «Я знаю, никакой моей вины...» (1966 г.).

Паэтычныя творы У. Набокава і М. Сяднёва вабяць Ю. Паталкова «высокоморальной лирической содержательностью». Па гэтай прычыне ён спадзяецца, што пакуты асобы, якая адлучана не па сваёй волі ад радзімы, стануць своеасаблівай формай маральнага ачышчэння і выратавання душы нашага сучасніка. Дзеля гэтага Юрый Васільевіч падрабязна апісвае перажыванні лірычнага героя, які не змог выратаваць свет ад расколу: чалавек не можа гарманічна суіснаваць ні з тымі, хто жыве на чужыне («каб сцярпець абыякавасць чужыны»), ні з «суродзічамі», бо яго хвалюе абязлічванне асобы ў савецкім грамадстве.

Ю. Паталкоў занепакоены, што тая «прекрасная сложность души», якую чытачу давялося знайсці ў творчасці паэтаў-эмігрантаў, «вымывается из личности в наше противоречивое время». Як не пагадзіцца па гэтым пытанні з Юрыем Васільевічам, што чацвёртая хваля эміграцыі – «каўбасная» – не мае нічога агульнага з «эміграцыяй страху». Адчуць глыбіню выказанай вышэй думкі дапамагае нам зварот даследчыка ў чарговы раз да сумеснага вывучэння паэтычнай спадчыны рускага і беларускага мастакоў слова: «Такой подход даёт нам возможность увидеть первую и вторую «волны» эмиграции как этапы единого гуманистического процесса, сутью которого был необходимый для любого создателя прекрасного поиск нравственного идеала, определение характера, типичного для эпохи» [13, с. 70].

У пошуках «нейкай бясспрэчнай гуманістычнай дасканаласці, якая б дапамагла сэрцу вытрымаць, перачакаць ліхалецце» [14, с. 22], даследчык уважліва ставіцца да кожнай дробязі: асобнага слова, радка, рэмарак, нязначных сюжэтных дэталяў, падтэкставых інтанацый і г.д. Тут няма нічога дзіўнага. Згодна канцэпцыі даследчыка, эмпатычнае літаратуразнаўства надае асаблівую ўвагу мастацкай дэталі. Яна разглядаецца Юрыем Васільевічам у якасці эмацыянальнага ключа да разумення ўсяго твора, як квінтэсэнцыя ўсёй псіхалагічнай карціны, якая прадстаўлена ў сюжэце.

Такі падыход дазваляе даследчыку нават у ідэалагізіраваных творах савецкага перыяду (гл. артыкул «Нравственно-философский фактор как доминантный в процессе становления и развития литературы») сканцэнтраваць увагу чытача на агульначалавечай праблематыцы, якая з часам не губляе сваёй дамінантнай ролі.

Напрыклад, пры аналізе рамана В. Катаева «Время, вперёд!» даследчык спыняе свой позірк на вобразе жанчыны, якая будучы цяжарнай працавала на будаўніцтве. Літаратуразнаўца цытуе ўрывак з рамана, дзе падрабязна апісваецца знешні выгляд жанчыны, і звяртае ўвагу на пытанні, якія ў сувязі з убачаным ставіць В. Катаеў: «Зачем она здесь? Что она думает? Какое отношение имеет ко всему происходящему? Неизвестно». «Сюжетная ситуация прозрения», як ахарактарызаваў вышэйразгледжаную сцэну Ю.Паталкоў, высвечвае пазіцыю пісьменніка і даследчыка: сапраўдны змест твора далёка не вычэрпваецца падзеямі аднаго рабочага дня на будаўніцтве Магнітагорскага металургічнага камбіната, адлюстраваннем працы брыгады будаўнікоў, якія вырашылі перакрыць норму па замесе бетону. Для творцаў важней паказаць: як цана рэкорду звязана з чалавечымі лёсамі.

Падобная сітуацыя сустракаецца ў апавяданні «После бала» Л. Талстога. Пісьменнік не дае адказу на пытанне: што неабходна для духоўнага ўдасканалення чалавека? Але сам успамін Івана Васілевіча з усімі падрабязнасцямі сцэны пакарання татарына, эмацыянальнасць апавядальніка – гэта і ёсць адказ, на думку прыхільніка эмпатычнага літаратуразнаўства, на пастаўленае пытанне, таму што «личное совершенствование человека – это работа его совести» [15, с. 89].

Як бачна, літаратуразнаўчыя працы Ю.В. Паталкова прасякнуты «духом открытия неоткрытого» [16, с. 3], новыми расстаноўками акцентаў у даследаванні творчасці М.Горкага і Я. Купалы, К. Чорнага і Б. Зайцава, А. Платонава і Л. Калюгі, А. Блока і М.Багдановіча, Я. Сіпакова і І. Бродскага, М. Сяднёва і У. Набокава і інш творцаў, якіх, безумоўна, аб'ядноўвае адзінае пачуццё гуманістычнай адказнасці перад гісторыяй, перад чытачом. Асэнсаваць творы пісьменнікаў мінулага стагоддзя як з'яву адзінага «мегасюжэта» – гэта важная задача сучаснага літаратуразнаўства, з якой, на наш погляд, паспяхова спраўляецца даследчык Ю.В. Паталкоў.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ


1. Потолков, Ю.В. Мотив движения народных множеств как нравственно-философский знак в русской и белорусской литературах XX века / Ю.В. Потолков // В мире литературы. – Брест: Издатель С.Б. Лавров, 2002. – Вып. 3. – С. 52–61.
2. Паталкоў, Ю.В. Сорам сэрца. Метафізічны змест аповесці «Суд у Слабадзе» Віктара Казько / Ю.В. Паталкоў // Роднае слова. – 2010. – № 4. – С. 28–30.
3. Паталкоў, Ю.В. Патрэба ў суперажыванні. Эмпатыя як сродак спасціжэння мастацкага свету беларускай літаратуры / Ю.В. Паталкоў // Беларуская мова і літаратура. – 2007. – №. 12. – С. 5–9.
4. Буланов, А.М. Художественная феноменология в романах Достоевского и Толстого («Идиот» и «Анна Каренина») / А.М. Буланов // Русская литература. – 2001. – № 1. – С. 94–102.
5. Потолков, Ю.В. Борис Зайцев и Кузьма Чёрный в кругу мифологемы «сердце» / Ю.В. Потолков // В мире литературы. – Брест: Издатель С.Б. Лавров, 2002. – Вып. 3. – С. 62–67.
6. Потолков, Ю.В. Эмпатическое литературоведение / Ю.В. Потолков // Вестник Брестского государственного технического университета – 2006. – № 6: Гуманитарные науки – С. 40–46.
7. Паталкоў, Ю.В. Адвечнасць, якая перамагае. Эмпатычны погляд на п'есу «Хто смяецца апошнім» Кандрата Крапівы» / Ю.В. Паталкоў // Роднае слова. - 2006. – № 11. – С. 12–16.
8. Паталкоў, Ю.В. Уласная поўня. Сустрэча з апавяданнем «Сузіранне начной поўні» Алеся Наварыча / Ю.В. Паталкоў // Роднае слова. – 2010. – № 11. – С. 33–34.

9. Паталкоў, Ю.В. Этыка духоўнага выжывання / Ю.В. Паталкоў // Роднае слова. – 2007. – № 3. – С. 39–41.
10. Потолков, Ю.В. Путь к покаянию (Об одной «неудобной» строке В. Маяковского) / Ю.В. Потолков // Русский язык и литература. – 2003. – № 7. – С. 105–114.
11. Потолков, Ю.В. Метафорические вечера сокровенного человека / Ю.В. Потолков // В мире литературы. – Брест: Издатель С.Б. Лавров, 2002. – Вып. 3. – С. 84–88.
12. Потолков, Ю.В. Молитва матери (Максим Горький и Янка Купала в 1906 году) / Ю.В. Потолков // В мире литературы. – Брест: Издатель С.Б. Лавров, 2002. – Вып. 3. – С. 89–92.
13. Потолков, Ю.В. Литературная эмиграция как морально-психологический феномен (на материале лирики В. Набокова и М. Седнёва) / Ю.В. Потолков // В мире литературы. – Брест: Издатель С.Б. Лавров, 2002. – Вып. 3. – С. 67–83.
14. Паталкоў, Ю.В. Топас чалавека пакаяннага. Раман «Млечны шлях» К. Чорнага і сучасная яму літаратура / Ю.В. Паталкоў // Роднае слова. – 2003. – № 10. – С. 20–23.
15. Потолков, Ю.В. Нравственно-философский фактор как доминантный в процессе становления и развития литературы / Ю.В. Потолков // Вестник Брестского государственного технического университета. – 2004. – № 6: Гуманитарные науки – С. 88–91.
16. Мищенчук, Н.И. Слово к читателю / Н.И. Мищенчук // В мире литературы. – Брест: Издатель С.Б. Лавров, 2002. – Вып. 3. – С. 3.


*Материал поступил в редакцию 08.10.11*

**BORSUK N.N. Abut expansion the humanitarian borders of penetration the Slavonic art: the aspects of creative works of the literary man Yury Vasilievich Potolkov**

The system of literary studying based on the priority of the emotional over the rational has been gradually finding its adherents. Yury Vasilievich Potolkov belong to them. It was him who first introduced into literary studying the so – called «emphatic point of view on the work of art». To the researcher's mind to define moral safety of the work of art is the prerogative of literary studying. According to this reason as the works of Y. V. Potolkov testify, the literary man pays attention on the analysis only of those works of art, in which «the morality of people's experiences became the object of reflection». On the sample of creative work of Belarusian and Russian writers (Ya. Sipakow, A. Platonow, U. Nabokow, M. Sednyov, I. Brodski, L. Kalyuga and the others) Yury Vasilievich Potolkov proves that the emphatic view of the work of art is not the romantic theory, not a next innovation but a basic concept.

УДК 821:161.1

***Потолков Ю.В.***

# МЕГАИДЕЯ ЭМПАТИЧЕСКОГО ТРИЕДИНСТВА И НАУКА О ЛИТЕРАТУРЕ

Под эмпатическим триединством мы имеем в виду сопереживательное сотрудничество трёх актантов духа в процессе извечного и неостановимого творения мира. Этими актантами являются Бог, человек-креатор и человек-реципиент. Сопереживание в данном случае мы понимаем как спонтанное совпадение чувств индивидов, оказавшихся в идентичных внешних обстоятельствах.

В такой ситуации находятся актанты духа, означенные выше: все они самодостаточно участвуют в едином вселенском движении, остановить которое невозможно. Богу (трактуемому нами как субстанциальное *состояние* стратегического идеального творения, созидающего одухотворенную физическую материю) принадлежит Первозамысел бытия.

Человек-креатор, вдохновенно поднимаясь над рационализмом повседневности, воспринимает Первозамысел Всевышнего и «переводит» его на язык понятий и образов, доступных человеческому восприятию: создаёт произведения искусства, открывает физические законы, придумывает полезные обществу технические приспособления и т.д. Наиболее убедительными примерами человека-креатора могут быть названы Иисус Христос, его апостолы и равные им личности из других религий, а также гении искусства и науки.

Завершает вселенское триединство человек-реципиент. Он воспринимает и Первозамысел, и его человеческое креативное воплощение в искусстве и науке, соотносит свою жизненную практику с условиями, в которые он поставлен первыми двумя актантами. При этом реципиент оказывается не только завершающей, но и начинающей сущностью триединства: каждый его шаг оказывается поводом для всё новых деяний Первотворца и человека-креатора.

Эмпатическое триединство – данность субстанциальная, извечная; оно спонтанно, надличностно, надисторично и пронизывает собою все проявления бытия – от вселенских до мельчайших в своей повседневности и поэтому никем из людей оспорено быть не может. Земная цивилизация (при всей своей трагической противоречивости) в пределах отпущенного ей временного срока и возможностей рационального познания действительности создала систему ценностей, независимо от человеческого сознания ставшую составной частью Божьего творения и в силу этого, безусловно, спасительную для землян.

Мегаидея, о которой мы ведём речь, является феноменом практического свойства и определяет собою сущность *этических* взаимоотношений между человеком и Богом, разумом земным и космическим, физикой и метафизикой. Как показывают факты истории, люди всегда стремятся определять форму и смысл своего духовного общения со Всевышним (а, следовательно, и характер межчеловеческих взаимоотношений) самостоятельно.

Тому есть объективные причины: единственным стимулом социального и вселенского движения оказывается данная свыше *боль* индивидуума (и Бога, и человека) по поводу несовершенства бытия. Безбольность означает смерть – и духовную, и физическую. Убеждённость в том, что миром правит любовь, правила о спасительности страдания не нарушает: любовь – это решимость личности собственным участием преодолевать все предстоящие жизненные испытания.

Человечество стремится избежать физических страданий. В этом ему помогает, спасибо ей, наука. Но попытки человечества обойтись без боли душевной только усиливают потенциал страданий физических (Сон разума порождает чудовищ). Мегаидея эмпатического триединства предполагает обязательную боль души: как можно спокойной, не страдающей душой возлюбить ближнего своего? Но иллюзия того, что преодолима и боль душевная, заставляет цивилизицию подменять своё самодостаточное участие в эмпатическом триедином творении мира разного рода *самостоятельными* духовными паллиативами. Например, появляются личности, стремящиеся к мировому господству; индивиды, объявляющие себя новым воплощением Господа; лидеры, императивно отстаивающие идею безбожной всечеловеческой гармонии и т.д.

Вопреки очевидному *единству* духовного и физического мира Человек отводит Богу *отдельную* нишу в своём сознании не связанную непосредственно с перипетиями повседневного общения людей между собой. Хомо сапиенсу трудно согласиться с тем, что взаимо-

***Потолков Юрий Васильевич,** кандидат филологических наук, доцент кафедры иностранных языков экономического факультета Брестского государственного технического университета.*
*Беларусь, БрГТУ, 224017, г. Брест, ул. Московская, 267.*